1. Разгледзьце тытульны ліст Бібліі, адлюстраваны на с. 81 вучэбнага дапаможніка. Паспрабуйце прачытаць надпіс. Што сведчыць аб любові першадрукара да свайго роднага горада?
2. Разгледзьце партрэт Францыска Скарыны на с. 82 вучэбнага дапаможніка. Што сведчыць аб справе, якой займаўся наш зямляк?
3. Прыдумайце малюнак для літары, з якой пачынаецца ваша імя. Выкарыстайце для прыкладу малюнак на с. 82 вучэбнага дапаможніка.

Разгледзьце малюнкі на с. 81, 82 вучэбнага дапаможніка. Што, на вашу думку, азначаюць выявы Сонца і Месяца, якія з'яўляюцца асабістым знакам Скарыны?

## 21. У КРАІНЕ МАЙСТРОЎ І ТВОРЦАЎ

У палацы Радзівілаў у Нясвіжы чакалі гасцей. Гаспадыня ўвайшла ў залу, дзе павінен быў адбыцца баль. Позірк яе міжволі спыніўся на высокіх сценах з люстэркамі ў пазалочаных рамах, на падвясных люстрах.

З люстраў звісалі крышталёвыя гірлянды з кветак і лісця. Калі запальвалі ўсе свечкі,

Правообладатель Издательский центр БГУ

зала палымнела ад мноства фарбаў і святла. Гаспадыня палаца з задавальненнем агледзела вялікі стол, накрыты для прыёму гасцей. Не забылася глянуць на вялікі кубак, які падымалі ў гонар асабліва паважанага госця. Сэрца гаспадыні напоўнілася гонарам, бо ўсё гэта былі вырабы са шкла беларускіх майстроў. І сёння шкляныя вырабы шырока вядомы ў Беларусі і за яе межамі.

Праверыла гаспадыня, ці цёпла ў памяшканні. Печы, абкладзеныя каляровай кафляй, грэлі добра. Кафля ўяўляла сабой гліняны выраб, які выкарыстоўваўся для абліцоўкі і аздаблення печаў. На кафлі можна было ўбачыць выявы людзей, жывёл, радавыя гербы. У су-




Кафлі з радавым гербам Льва Сапегі і гербам Вялікага Княства Літоўскага

 Правообладатель Издательский центр БГУ

часным жыцці ролю кафлі выконвае керамічная плітка.

Разгледзьце карту на с. 10—11 атласа. Пакажыце на ёй кафлю і дзе яна выраблялася.

Настаў час рыхтавацца да прыёму і гаспадару палаца. Ён паклікаў да сябе слугу, які прынёс урачыстае адзенне. Погляд гаспадара затрымаўся на прыгожым шматколерным поясе, які пад сонечнымі прамянямі пераліваўся ўсімі колерамі вясёлкі.



Мужчынскае адзенне, аздобленае слуцкім поясам

Правообладатель Издательский центр БГУ 

Успомніліся гаспадару іншаземныя шаўковыя паясы, якія прывозіліся з замежных краін. І падумаў ён: а чаму не наладзіць вытворчасць такіх паясоў у сябе? Неўзабаве каля Нясвіжа з’явілася першая майстэрня па вырабе паясоў.

Праз некаторы час падобная майстэрня была заснавана ў Слуцку. Спачатку тут працавалі персідскія і турэцкія майстры. Яны перадалі свой вопыт мясцовым умельцам. Для заможных людзей слуцкія паясы ткаліся з шаўковых, залатых і сярэбраных нітак. Для сялян — з лёну і воўны.

Разгледзьце карту на с. 10—11 атласа. Пакажыце на ёй слуцкія паясы і гарады, дзе яны вырабляліся.

Беларускі паэт **Максім Багдановіч** прысвяціў адзін са сваіх вершаў слуцкім майстрам:

*Цямнее край зубчаты бору...*
*І тчэ, забыўшыся, рука*
*Заміж персідскага ўзору*
*Цвяток радзімы васілька.*

Магчыма, вам давядзецца пабываць на экскурсіі ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі ў Мінску. Там можна ўбачыць цуд — знакамітыя слуцкія паясы.

 Правообладатель Издательский центр БГУ



Максім Багдановіч

## Карысна ведаць

Беларускія майстры стварылі той тып пояса, які атрымаў назву «слуцкі». Ён дасягаў больш чым двухметровай даўжыні. Паясы рабіліся з вельмі тонкай воўны. Пры шырыні ў два локці (каля 1,3 метра) іх можна было працягнуць праз пярсцёнак. Слуцкія ткачы ўнеслі ў малюнак паясоў узоры, што былі найбольш блізкія і родныя іх сэрцам. Да таго ж адзін пояс



Слуцкі пояс

Правообладатель Издательский центр БГУ

не паўтараў другі. Сёння ў Слуцку працуе фабрыка мастацкіх вырабаў, дзе вырабляюць паясы па старажытных узорах.

1. Чаму Беларусь называлі краінай майстроў?
2. Адкажыце, чаму сэрца гаспадыні Нясвіжскага палаца поўнілася гонарам.
3. Раскажыце, чым знакаміты слуцкія паясы.
4. Навошта была патрэбна кафля?

Вызначце, чаму сучасныя беларускія самалёты маюць узор, які вы бачыце на фота.




Самалёт кампаніі «Белавія»

 Правообладатель Издательский центр БГУ

# 22. АД БАТЛЕЙКІ — ДА ПАЛАНЭЗА

У 16 стагоддзі людзі пачалі ствараць невялікія тэатры. Адным з такіх тэатраў быў народны лялечны тэатр — **батлейка**. Для паказаў батлейкі рабілі двухпавярховую скрынку з дзверцамі. Батлеечнік рухаў лялькі, вымаўляў за іх словы. Лялькі выраблялiся з дрэва, тканіны, каляровай паперы. Валасы, бровы і вусы рабілі з лёну і аўчыны. Вопратку для лялек шылі з тканіны.

У якасці галоўных герояў выступалі Баба, Цар, Анёл, Мужык, Каза, Мядзведзь. Тых, каго ніколі не шанавалі ў народзе, — гультая, злодзея, хітрага гандляра — заўжды



Батлейка

Правообладатель Издательский центр БГУ

высмейвалі. Затое з сімпатыяй успрымаўся гледачамі вобраз працавітага селяніна.

Батлеечнікі вандравалі па ўсёй краіне. Іх сустракалі як самых дарагіх гасцей. Асабліва радаваліся дзеці, бо ў лялечным тэатры было шмат таямнічага.

Тэатры існавалі і ў школах. У горадзе Полацку пры адным з манастыроў манах-настаўнік **Сімяон** стварыў школьны тэатр. А праз некалькі гадоў ён быў запрошаны ў Маскву, дзе стаў настаўнікам царскіх дзяцей. Самога Сімяона ў Маскве пачалі называць **Полацкім**. Тут ён адкрыў друкарню. Першай друкаванай кнігай стаў «Буквар»,



Сімяон Полацкі


Правообладатель Издательский центр БГУ

які ён склаў сам. З яго ўдзелам пры двары рускага цара быў створаны прыдворны тэатр. У якасці акцёраў там выступалі нашы землякі.

Разгледзьце карту «Славутыя людзі зямлі беларускай» на с. 14—15 атласа. Пакажыце на ёй партрэт Сімяона Полацкага, помнік яму і горад, дзе гэты помнік знаходзіцца.

Тэатры ўзнікалі ў замках і палацах заможных людзей. Адным з такіх тэатраў стаў тэатр Радзівіла ў Нясвіжы, які ўмяшчаў каля дзвюх тысяч гледачоў. Шырокую вядомасць набыў таксама Слонімскі тэатр **Міхала Казіміра Агінскага**. Тэатральная сцэна там была падзелена на дзве часткі. На пярэдняй частцы можна было раз'язджаць нават на конях. Задняя частка магла запаўняцца вадой. Калі было трэба, на сцэну выплывалі чаўны і нават караблі. Музыкантамі, спевакамі, танцорамі ў тэатры былі пераважна таленавітыя беларускія сяляне.

Разгледзьце карту на с. 10—11 атласа. Пакажыце на ёй тэатр Міхала Казіміра Агінскага і горад, дзе гэты тэатр з'явіўся.

У канцы **18 стагоддзя** тэрыторыю Рэчы Паспалітай разам з беларускімі землямі падзялілі іншыя краіны. Беларускія землі былі ўключаны ў склад **Расіі**. А напачатку

Правообладатель Издательский центр БГУ



Міхал Казімір Агінскі і яго тэатр

19 стагоддзя пляменнік Міхала Казіміра Агінскага **Міхал Клеафас Агінскі** напісаў славуты музычны твор. Гэты твор — паланэз «Развітанне з Радзімай». Нават і сёння паланэз вельмі папулярны і чаруе сваёй прыгажосцю сучасных слухачоў.

Разгледзьце карту «Славутыя людзі зямлі беларускай» на с. 14—15 атласа. Пакажыце на ёй помнік Міхалу Клеафасу Агінскаму і горад, дзе гэты помнік знаходзіцца.

1. Раскажыце пра батлейку і лялькі, якія ўдзельнічалі ў прадстаўленні.
2. Чаму Сімяона ў Маскве пры двары рускага цара назвалі Полацкім?


Правообладатель Издательский центр БГУ

3. Раскажыце пра дзейнасць Сімяона Полацкага.
4. Апішыце Слонімскі тэатр Міхала Казіміра Агінскага.

1. Разгледзьце малюнак на с. 91 вучэбнага дапаможніка. Пакажыце батлеечныя лялькі Бабы, Цара, Анёла, Мужыка, Казы.
2. Разгледзьце партрэт Сімяона Полацкага на с. 92 вучэбнага дапаможніка. Па чым можна здагадацца, што на партрэце выяўлены манах-настаўнік?

Праслухайце паланэз «Развітанне з Радзімай». Раскажыце аб пачуццях, якія выклікае ў вас гэты музычны твор.

## 23. ПЕСНЯРЫ РОДНАЙ МОВЫ І БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Абаронцам працоўнага люду стаў паэт **Францішак Багушэвіч**, які жыў у 19 стагоддзі. Дзяцінства яго прайшло сярод сялянскіх дзяцей. Скончыўшы ліцэй, ён працаваў абаронцам у судзе і заўсёды падтрымліваў просьбы сялян. Яны жылі вельмі цяжка і залежалі ад свайго пана, бо не мелі ўласнай зямлі. Сяляне абураліся. А Францішак спрабаваў абараніць іх чалавечую годнасць.

Правообладатель Издательский центр БГУ 



Францішак
Багушэвіч




Надпіс на помніку
Францішку Багушэвічу

Францішак Багушэвіч у зборніку вершаў «Дудка беларуская» заклікаў беларускі народ берагчы і шанаваць родную мову: «Братцы мілыя, дзеці зямлі-маткі маёй! Вам ахвяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую... „мужыцкай“ завуць, а завецца яна „беларускай“... Не пакідайце ж нашай мовы беларускай, каб не ўмёрлі!»

Гэтыя словы служаць для нас запаветам і сёння. Беларуская мова, як і руская, з'яўляецца дзяржаўнай у Рэспубліцы Беларусь.

У пачатку 20 стагоддзя моцна загучалі галасы народных паэтаў Беларусі **Янкі Купалы** і **Якуба Коласа**. Паэты былі равеснікамі, бо абодва нарадзіліся ў 1882 годзе. Янка Купала —

 Правообладатель Издательский центр БГУ




Янка Купала



Якуб Колас

у вёсцы Вязынка, а Якуб Колас — у вёсцы Акінчыцы, што на Міншчыне. Абодва любілі родны край, сваю Айчыну і мову, свой народ. У спадчыну нашчадкам яны пакінулі цудоўныя творы.

А Разгледзьце карту «Славутыя людзі зямлі беларускай» на с. 14—15 атласа. Пакажыце на ёй партрэты Янкі Купалы і Якуба Коласа. Адшукайце на карце помнікі ім і вёскі, дзе нарадзіліся паэты.

Як пранікнёна і ў той жа час проста гучаць словы Якуба Коласа:

*Мой родны кут, як ты мне мілы!..*
*Забыць цябе не маю сілы!..*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Горда і сцвярджальна прагучалі радкі Янкі Купалы:

*Ад прадзедаў спакон вякоў*
*Мне засталася спадчына;*
*Паміж сваіх і чужакоў*
*Яна мне ласкай матчынай...*

Сёння мы па праве называем Янку Купалу і Якуба Коласа вялікімі песнярамі зямлі беларускай. У іх мы вучымся любіць родную мову і сваю Бацькаўшчыну.

Паэтычную спадчыну працягнуў у сваёй музычнай творчасці ў 20 стагоддзі народны артыст Беларусі **Уладзімір Мулявін**. Ён стварыў вельмі папулярны вакальна-інструментальны ансамбль «Песняры». Пад яго рукой заўсёды быў томік вершаў Янкі Купалы, адкуль музыкант і ўзяў назву ансамбля. Стваральнік ансамбля спецыяльна вывучыў беларускую мову, каб



Уладзімір Мулявін

 Правообладатель Издательский центр БГУ

лепш разумець беларускія народныя песні. А слухачы, якія не ведалі беларускай мовы, набывалі ў кнігарнях беларуска-рускія слоўнікі. І гэта дзеля таго, каб перакласці радкі песень любімых «Песняроў». За сваю творчасць Уладзімір Мулявін быў узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны.

Добрай традыцыяй у Рэспубліцы Беларусь стала святкаванне Дзён беларускага пісьменства. Яны праходзяць у гарадах, якія з'яўляюцца гістарычнымі цэнтрамі культуры, навукі, літаратуры і кнігадрукавання. Удзельнікі і госці свята могуць азнаёміцца з новымі кнігамі, сустрэцца з пісьменнікамі, паслухаць выступленні музыкантаў. І, канешне, гаспадары і госці святаў размаўляюць адно з адным па-беларуску.

Дасягненні беларусаў у развіцці культуры — гэта гістарычная спадчына. Яна выклікае павагу да нашай Радзімы ва ўсім свеце.

1. Да чаго заклікаў Францішак Багушэвіч?
2. Дакажыце, што ў радках Янкі Купалы і Якуба Коласа адлюстравана любоў да Бацькаўшчыны.
3. Навошта Уладзімір Мулявін спецыяльна вывучыў беларускую мову, а яго слухачы набывалі беларуска-рускія слоўнікі?
4. Чаму Дні беларускага пісьменства неаднойчы адзначаліся ў Полацку?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Даведайцеся, якія сапраўдныя імёны Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Праслухайце песню «Мой родны кут» у выкананні ансамбля «Песняры». Раскажыце аб пачуццях, якія выклікае ў вас гэты музычны твор.

## 24. БУДАЎНІЦТВА НОВАГА ЖЫЦЦЯ

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў **1917 годзе** ў Беларусі ўсталявалася савецкая ўлада. Рабочыя і сяляне пачалі будаваць новае жыццё. Дзень **7 лістапада**, калі адбылася рэвалюцыя, абвешчаны ў Беларусі святочным днём. У **1919 годзе** была створана **Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка — БССР**. Гэта дзяржава паклала пачатак самастойнаму жыццю беларускага народа. У **1922 годзе** БССР і іншыя савецкія рэспублікі аб'ядналіся. Яны ўтварылі адну вялікую дзяржаву — **Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР)**. Магчыма, у Савецкім Саюзе нарадзіліся, выраслі, атрымалі адукацыю вашы дзядулі і бабулі.

У складзе Савецкага Саюза працоўныя нашай краіны будавалі гарады, заводы, фабрыкі, электрастанцыі. Было цяжка, аднак людзей не пакідала надзея на лепшую будучыню.

 Правообладатель Издательский центр БГУ